# Беларусь, Літва, Малдова: скрыжаванне перспектыў

## ДАРОГАМІ ПАРТНЁРСТВА

**У канцы верасня прадстаўнікі мясцовага дабрачыннага фонду «Спадчына Міхала Клеафаса Агінскага» сумесна з калегамі з Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў, Рэспубліканскай канфедэрацыі прадпрымальніцтва і ТАА «Заслаўе-Тур» прынялі ўдзел у міжнародным беларуска-літоўска-малдаўскім семінары па развіцці супрацоўніцтва паміж краінамі СНД і Еўрапейскім Саюзам. Мерапрыемства было арганізавана бізнес-цэнтрам горада Рэтаваса і прайшло ў Літве.**

На семінары члены і валанцёры фонду падзяліліся вопытам работы з замежнымі партнёрамі, а таксама прынялі ўдзел у пасяджэннях за круглым сталом на тэмы супрацоўніцтва ў галіне культуры, ролі моладзі ў сацыяльна-эканамічным развіцці краіны і іншых. Расказалі яны і пра эканамічны патэнцыял Маладзечаншчыны.

Сустрэчы праходзілі ў Міністэрстве сельскай гаспадаркі Літвы, Жамойцкай калегіі, Рэтаваскім бізнес-цэнтры, на многіх прадпрыемствах і ў арганізацыях розных рэгіёнаў суседняй дзяржавы.

У час аднаго з пасяджэнняў удзельнікі абмяркавалі перспектывы супрацоўніцтва па праграме «Рэгіён Балтыйскага мора». Гэта праграма накіравана на актывізацыю творчых ініцыятыў дзяржаўных і грамадскіх арганізацый многіх краін свету.

Вясной наступнага года такі семінар вырашана правесці ў Беларусі. Яго ўдзельнікі наведаюць у тым ліку і Маладзечна.

**Павел САПОЦЬКА,**
**член праўлення мясцовага дабрачыннага фонду «Спадчына Міхала Клеафаса Агінскага».**

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ